**Зарэгістравана**
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
«_15_» _чэрвеня_ 1999 г.
Пасведчанне аб рэгістрацыі
№ 00111

**Зацверджаны**
Устаноўчым сходам

«_20_» _жніўня_ 1998 г.

**Зарэгістраваны**
**ў новай рэдакцыі**
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
«_7_» _лютага_ 2001 г.

Унесены змяненні
і дапаўненні.
**Зацверджаны ў новай**
**рэдакцыі**
Агульным сходам
«_21_» _кастрычніка_ 2000 г.

**Зарэгістраваны**
Міністэрствам юстыцыі
Рэспублікі Беларусь
«_9_» _кастрычніка_ 2002 г.
Пасведчанне аб рэгістрацыі
№ 00111

**Унесены змены**
Агульным сходам

«_10_» _верасня_ 2002 г.

# СТАТУТ
# Грамадскага аб’яднання “Праваабарончы цэнтр “Вясна”

Мінск, 2002 г.

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр "Вясна" — недзяржаўная, некамерцыйная, непалітычная грамадская арганізацыя, добраахвотна створаная грамадзянамі Рэспублікі Беларусь дзеля сумеснай рэалізацыі грамадзянскіх, сацыяльных і культурных правоў, гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

1.2. Назва грамадскага аб'яднання:

поўнае: Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр "Вясна"

1.3. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ажыццяўляе сваю дзейнасць на падставе дабраахвотнасці, галоснасці, самакіравання, самастойнасці і раўнапраў'я яго сяброў, кіруючыся дзеючай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1999 г. № 2 ''Аб некаторых мерах па ўпарадкаванню дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў'', Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях'', іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, міжнароднымі дамовамі, ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь, і дадзеным Статутам.

1.4. Характар дзейнасці ---- абарона правоў чалавека.

1.5 Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае самастойны баланс, пячатку, штампы і бланкі са сваёй назвай, разліковыя рахункі ў банкаўскіх установах. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ад свайго імя ўступае ў адносіны з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, набывае маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, з'яўляецца істцом і адказчыкам у судах.

1.6. Дзейнасць Грамадскага аб'яднання ''Правабарончы цэнтр "Вясна" ажыццяўляецца на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.7. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' адказвае па сваіх абавязках уласнай маёмасцю. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' не адказвае па абавязках сваіх сяброў, а сябры не адказваюць па абавязках Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр "Вясна" не нясе адказнасці па абавязках дзяржавы (яе органаў і арганізацый).

1.8 Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' можа мець сваю сімволіку, якая зацвярджаецца Радай Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр "Вясна"і рэгіструецца ва ўстаноўленым парадку.

1.9 Справаводства ў Грамадскім аб'яднанні ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' вядзецца ва ўстаноўленым законам парадку ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Дакументацыя па асабістаму складу перадаецца ва ўстановы, якія захоўваюць
Нацыянальны архіўны фонд Рэспублікі Беларусь, па месцы знаходжання юрыдычнага адрасу.

1.10 Юрыдычны адрас Грамадскага аб'яднання «Праваабарончы цэнтр "Вясна'':
220053 г. Мінск, Сморгаўскі праезд, д.3, кв.1, тэл. 288-05-35 (змены ўнесены Агульным сходам 10.09.2002 г., пратакол № 5).

## 2. Мэты, задачы, метады дзейнасці і правы Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр "Вясна"

***2.1. Асноўнай мэтай дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр "Вясна" з'яўляюцца:***

— садзейнічанне фарміраванню грамадзянскай супольнасці, заснаванай на павазе да правоў чалавека, якія вынікаюць з Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

— абарона правоў і прадстаўленне законых інтарэсаў у дзяржаўных, гаспадарчых і грамадскіх органах і арганізацыях сваіх сябраў (удзельнікаў). Абарона правоў іншых грамадзян ажыцяўляецца толькі ў выпадках і парадку, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам;

***2.2. Асноўныя задачы Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр "Вясна":***

— практычная дапамога ў рэалізацыі разнастайных грамадскіх ініцыятыў, звязаных з прававой абаронай грамадзян;

— вывучэнне стану грамадзянскай супольнасці і прававой абароны ў Рэспубліцы Беларусь;

— папулярызацыя грамадазнаўчых і прававых ведаў;

— дэмакратычна-прававая адукацыя грамадзян;

— падтрымка грамадскіх ініцыятыў у праваабарончай дзейнасці;

— спрыянне духоўнаму і культурнаму адраджэнню беларускай дзяржавы, што з'яўляецца падмуркам павагі да правоў чалавека.

***2.3.Метады дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр "Вясна":***

— збор інфармацыі пра ход фарміравання грамадзянскай супольнасці і стану прававой культуры ў Рэспубліцы Беларусь;

— ініцыіраванне і рэалізацыя уласных праектаў і праграм у праваабарончай дзейнасці, у адпаведнасці з заканадаўствам;

— арганізацыя і правядзенне семінараў, канферэнцый, лекцый, сустрэч, круглых сталоў па пытаннях статутнай дзейнасці, у тым ліку для сябраў Грамадскага аб'яднання «Праваабарончы цэнтр «Вясна», накіраваных на павышэнне іх кваліфікацыі, неабходнай для якаснага ажыцяўлення статных мэтаў і задач Грамадскага аб'яднання «Праваабарончы цэнтр «Вясна»;

— арганізацыя грамадазнаўчых даследванняў, маніторынгаў стану забеспячэння правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, садзейнічанне ў выкананні міжнародных дагавароў па правам чалавека, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь;

— выданне і распаўсюджванне, у адпаведнасці з законам, уласных інфармацыйных, навуковых, навукова-папулярных і іншых праваабарончых матэрыялаў у перыядычнай і неперыядычнай форме;

— спрыянне стварэнню маладзёжных арганізацый праваабарончага накірунку;

— падтрымка кантактаў з усімі галінамі ўлады і дэпутатамі ўсіх узроўняў, з грамадскімі, гаспадарчымі, навуковымі і навучальнымі арганізацыямі і ўстановамі, уступленне з імі ў дагаварныя адносіны і ўзаемадзеянне дзеля дасягнення статутных мэтаў і вырашэння задач Грамадскага аб'яднання ‘‘Праваабарончы цэнтр ‘‘Вясна’’

—аказаненне неабходнай дапамогі асобам, якія звярнуліся у Грамадскае аб’яднанне ‘‘Правааабарончы цэнтр ‘‘Вясна’’.

***2.4. Для дасягнення сваіх мэтаў Грамадскае аб’яднанне ‘‘Праваабарончы цэнтр ’’Вясна’’ мае права:***

— ад свайго імя заключаць дагаворы, набываць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, несці па іх абавязацельствы;

— мець ва ўласнасці, карыстацца і распараджацца па свайму меркаванню маёмасцю, неабходнай для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці, зацверджанай Статутам, акрамя аб’ектаў, якія могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці дзяржавы;

— уступаць у міжнародныя і рэспубліканскія асацыяцыі і саюзы грамадскіх аб'яднанняў, падтрымліваць непасрэдныя міжнародныя кантакты, удзельнічаць у праектах і мерапрыемствах, якія не супярэчаць заканадаўству і міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь;

— бесперашкодна атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю, якая мае дачыненне да дзейнасці Грамадскага аб’яднання ‘‘Праваабарончы цэнтр ‘‘Вясна’’;

— засноўваць уласныя і карыстацца ва ўстаноўленым парадку дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі; ажыццяўляць выдавецкую дзейнасць;

— ажыццяўляць вытворча-гаспадарчую дзейнасць, накіраваную на вырашэнне статутных мэтаў і задач.

## 3. Структура, кіруючыя і кантрольныя органы Грамадскага аб’яднання ‘‘Праваабарончы цэнтр “Вясна”

3.1. Грамадскае аб’яднанне “Праваабарончы цэнтр “Вясна” складаецца з рэгіянальных арганізацый (аддзяленняў). Рэгіянальныя арганізацыі (аддзяленні) ствараюцца па тэрытарыяльнай прыкмеце ў Рэспубліцы Беларусь пры наяўнасці не меньш 10(3) сяброў Грамадскага аб’яднання “Праваабарончы цэнтр “Вясна”.

Арганізацыі (аддзяленні) маюць тыя ж мэты, задачы і метады дзейнасці што і Грамадскае аб’яднанне “Праваабарончы цэнтр “Вясна” ў цэлым, але ў межах сваёй кампетэнцыі, і дзейнічаюць у адпаведнасці з дадзеным Статутам і рашэннямі Рады Грамадскага аб’яднання “Праваабарончы цэнтр “Вясна

3.2 “Па рашэнню Рады Грамадскага аб’яднання “Праваабарончы цэнтр “Вясна” арганізацыям (аддзяленням) могуць быць нададзены правы юрыдычнай асобы. Структура выбарных органаў, формы і умовы дзейнасці рэгіянальных арганізацый (аддзяленняў) вызначаюцца іх вышэйшым органам — Сходам.

Рэгіянальныя арганізацыі (аддзяленні) справаздачныя перад Радай Грамадскага аб’яднання “Праваабарончы цэнтр “Вясна” і могуць быць ліквідаваныя па яе рашэнню”.

3.3. Вышэйшы орган Грамадскага аб’яднання ‘‘Праваабарончы цэнтр ‘‘Вясна’’— Агульны сход, які склікаецца ў адпаведнасці з планам працы ці пры неабходнасці, але не радзей чым адзін раз на год.

3.3.1. Агульны сход склікаецца па рашэнні Рады. Ініцыятыва аб правядзенні пазачарговага Агульнага сходу можа зыходзіць ад Старшыні Рады, Рэвізійнай камісіі ці ад не менш чым 1/2 сяброў Грамадскага аб’яднання ‘‘Праваабарончы цэнтр ‘‘Вясна’’. Ініцыятыва правядзення Агульнага сходу ў пісьмовым выглядзе з паданнем прапанаванага парадку дня перадаецца Радзе.

3.3.2. Рада склікае Агульны сход не пазней чым праз 10 дзён пасля атрымання ініцыятывы аб яго правядзенні.

3.3.3. Пра час правядзення і парадак дня Агульнага сходу сябры Грамадскага аб’яднання ‘‘Праваабарончы цэнтр ‘‘Вясна’’ павінны быць папярэджаны Радаю не пазней чым за 5 дзён да яго склікання.

3.3.4. Агульны сход лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічаюць больш за палову сябраў Грамадскага аб’яднання ‘‘Праваабарончы цэнтр ‘‘Вясна’’. Рашэнні аб ліквідацыі, рэарганізацыі і ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Статут прымаюцца не меньш чым 2/3 галасоў прысутных, па ўсіх іншых пытаннях

- простай большасцю галасоў. Форму галасавання вызначае Агульны сход. З ініцыятывы пяці чалавек, вызначанай адкрытым галасаваннем, можа праводзіцца пайменнае галасаванне.

3.3.5. Да кампетэнцыі Агульнага сходу Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' адносяцца:

— вызначэнне асноўных накірункаў дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— зацвярджэнне Статута, унясенне ў яго зменаў і дапаўненняў;

— выбранне і адкліканне сяброў Рады, заслухоўванне і зацвярджэнне яе справаздач;

— выбранне і адкліканне Старшыні Рады;

— выбранне і адкліканне членаў Рэвізійнай камісіі, заслухоўванне і зацвярджэнне яе справаздач;

— зацвярджэнне рашэнняў Рады аб адчужэнні і набыцці маёмасці, распараджэнні ўласнасцю, аб выключэнні сябраў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' за парушэнні патрабаванняў Статута.

— прыняцце рашэння аб ліквідацыі ці рэарганізацыі Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

3.3.6. Старшыня Рады, члены Рады і Рэвізійнай камісіі абіраюцца Агульным сходам тэрмінам на 1 год. Галасаванне праводзіцца асобна па кожнай кандыдатуры. Рашэнне прымаецца без уліку галасоў тых, адносна каго яно прымаецца.

3.3.7. Агульны сход мае права разглядаць і вырашаць любыя іншыя пытанні дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''. Парадак дня Агульнага сходу прапаноўваецца Радаю. Кожны сябра Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' мае права на Агульным сходзе ўносіць прапановы да парадку дня.

3.3.8 Пытанне аб зацвярджэнні рашэнняў Рады пра выключэнне Сяброў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончыы цэнтр ''Вясна'' за парушэнні Статута на Агульным сходзе разглядаецца першым. Вызначэнне кворуму і прыняцце рашэння па гэтым пытанні адбываецца без уліку галасоў тых, у дачыненні да каго прымаюцца рашэнні.

3.3.9. Старшынствуе на Агульным сходзе Старшыня, які абіраецца сходам простай большасцю галасоў. На Агульным сходзе вядзецца пратакол, які падпісваюць Старшыня і сакратар сходу.

3.4. У перыяд паміж Агульнымі сходамі дзейнасцю Грамадскага аб'яднання ''Праваабартончы цэнтр "Вясна" кіруе Рада, якая справаздачная перад Агульным сходам.

3.4.1. Рада складаецца з 5 чалавек, абраных Агульным сходам.

3.4.2. Пасяджэнні Рады праводзяцца адпаведна распрацаванаму плану працы ці па неабходнасці, але не радзей чым адзін раз на тры месяцы. Старшынствуе на пасяджэнні Старшыня Рады, а пры яго адсутнасці - адзін з сяброў Рады. На пасяджэннях Рады вядзецца пратакол. Кожны член Рады мае права абумовіць у ім сваё персанальнае меркаванне. Пратакол падпісваюць старшыня і сакратар пасяджэння Рады.

3.4.3. Да кампетэнцыі Рады адносіцца:

— распрацоўка і зацвярджэнне планаў працы Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', планаў працы Рады, зыходзячы з асноўных накірункаў дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр '' Вясна'';

— прыняцце рашэнняў па вядзенню фінансавай і гаспадарчай дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— пошук і стварэнне перспектыўных праграм і праектаў, распрацоўка дзелавых і фінансавых планаў, іх зацвярджэнне;

— прыняцце рашэнняў аб стварэнні аддзяленняў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтра ''Вясна'' і наданні ім правоў юрыдычнай асобы, а таксама аб іх ліквідацыі;

— прыняцце рашэнняў аб набыцці, распараджэнні і адчужэнні маёмасці (апошняе зацвярджаецца Агульным сходам), наданне паўнамоцтваў органам і службовым асобам Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' на кіраванне яго маёмасцю і сродкамі;

— прыняцце рашэнняў аб прыёме і аб выключэнні з сябраў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— вызначэнне памеру членскіх узносаў і парадку іх унясення;

— зацвярджэнне ўзораў сімволікі Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', парадку яе выкарыстання;

— зацвярджэнне ўзораў пячаткі, штампа, бланкаў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— прыняцце рашэнняў аб правядзенні перад Агульным сходам перарэгістрацыі;

— прыняцце заяў ад імя Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— вырашэнне іншых пытанняў, звязаных з дзейнасцю Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', не залічаных да выключнай кампетэнцыі іншых яго органаў.

3.4.4. Пасяджэнне Рады лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае больш паловы яе сяброў. Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў прысутных на пасяджэнні членаў Рады. Форму галасавання Рада выбірае самастойна.

3.4.5. Рашэнні Рады могуць быць абскарджаны і адменены на Агульным Сходзе.

3.5. У прамежках паміж пасяджэннямі Рады бягучай дзейнасцю Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' кіруе Старшыня Рады.

3.5.1. Старшыня Рады валодае ўсімі правамі і абавязкамі кіраўніка юрыдычнай асобы, у тым ліку:

— кіруе працаю Рады, склікае і праводзіць яе пасяджэнні, падпісвае ад імя Рады ўсе дакументы;

— забяспечвае выкананне рашэнняў Рады і Агульнага сходу;

— мае права першага подпісу, без даверанасці дзейнічае ад імя Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', прадстаўляе яго інтарэсы ў адносінах з грамадзянамі, арганізацыямі, установамі, службовымі асобамі, заключае і падпісвае дагаворы і іншыя дакументы, выдае даверанасці, адкрывае ў банках разліковыя і іншыя рахункі;

— вырашае пытанні прыёму на працу і звальнення супрацоўнікаў;

— накладае дысцыплінарныя спагнанні;

— кіруе маёмасцю Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', распараджаецца яго сродкамі адпаведна патрабаванням заканадаўства, гэтага Статута, рашэнняў Рады;

— дзеля выканання статутных мэтаў забяспечвае магчымасць сябрам Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр 'Вясна'' атрымліваць інфармацыю аб дзейнасці аб'яднання, карыстацца яго матэрыяльна-тэхнічнай базай;

— забяспечвае распаўсюджванне інфармацыі пра дзейнасць аб'яднання;

— ажыццяўляе іншыя выканаўча-распарадчыя функцыі ў межах, вызначаных Радаю Грамадскага аб'яданання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', і вырашае ўсе пытанні дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', якія не ўваходзяць у кампетэнцыю Агульнага сходу і іншых органаў.

3.5.2. Пры часовай адсутнасці Старшыні Рады ягоныя абавязкі выконвае адзін з членаў Рады, якога прызначае Старшыня Рады.

3.6. Кантрольна-рэвізыйным органам Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''з'яўляецца Рэвізійная камісія.

3.6.1. Рэвізійная камісія складаецца з трох чалавек, абраных Агульным сходам.

3.6.2. Члены Рэвізійнай камісіі не могуць з'яўляцца членаў Рады, кіраўнікі і галоўныя спецыялісты прадпрыемстваў, створаных Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

3.6.3. Члены Рэвізійнай камісіі паводле свайго меркавання на працягу пяці дзён пасля Агульнага сходу са свайго складу выбіраюць Старшыню на тэрмін паўнамоцтваў камісіі. Пасяджэнні Рэвізійнай камісіі праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей чым адзін раз на год.

3.6.4. Пасяджэнні Рэвізійнай камісіі правамоцны, калі на іх прысутнічае больш за палову членаў. Рашэнні Рэвізійнай камісіі прымаюцца простай большасцю галасоў яе членаў.

3.6.5. Рэвізійная камісія:

— вызначае рэгламент і методыку сваёй працы;

— мае права вывучаць любыя дакументы, якія датычацца фінансава-гаспадарчай дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

—ажыцяўляе кантроль за выкананнем Статута Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', правоў і абавязкаў ягоных сяброў, дзейнасць выбарных кіраўнічых органаў, службовых асоб Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— ажыццяўляе кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю.

3.6.6. Пры зваротах сябра грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' з любой ініцыятывай у Рэвізійную камісію яе Старшыня на працягу 10 дзён павінен даць таму, хто звярнуўся, вусны (а калі той дамагаецца — і пісьмовы) адказ аб разглядзе ці парадку разгляду ягонага звароту.

3.6.7. Рэвізійная камісія робіць справаздачу аб сваёй дзейнасці на Агульных сходах Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

3.6.8. Усе пасяджэнні Рэвізійнай камісіі афармляюцца пратаколамі.

3.7. Адкліканне і перавыбары сленаў выбарных органаў.

3.7.1. Адкліканне і перавыбары членаў выбарных органаў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' адбываецца на Агульным сходзе. Форма галасавання вызначаецца Агульным сходам.

3.7.2. Пытанне пра адкліканне членаў выбарных органаў можа ініцыявацца любым сябрам Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''. Галасаванне праводзіцца па кожнай кандыдатуры асобна. Рашэнне прымаецца без уліку галасоў тых, адносна каго яно прымаецца.

3.7.3. Выбранне членаў кіруючага і кантрольнага органаў замест выбыўшых адбываецца ў месячны тэрмін.

3.7.4. У выпадку адклікання (спынення сяброўства) на працягу тэрміну сваіх паўнамоцтваў больш як паловы складу Рады ці Рэвізійнай камісіі праводзяцца новыя выбары гэтых органаў і Старшыні Рады.

## 4. Сябры Грамадскага аб'яднання "Праваабарончы цэнтр "Вясна", іх правы абавязкі.

4.1. Сябрам Грамадскага аб'ядання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' можа стаць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 16-гадовага ўзросту, замежны грамадзянін і асоба без грамадзянства, якія маюць сталае месца жыхарства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, незалежна ад нацыянальнасці, партыйнасці, веравызнання і сацыяльнага становішча, якія цікавяцца станам абароны правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, жадаюць працаваць у праваабарончым накірунку,

прызнаюць гэты Статут і добраахвотна ўносяць пасільны ўклад у рэалізацыю статутных мэтаў і задач.

4.2. Сяброўства ў Грамадскім аб'яднанні ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' фіксаванае.

4.3. Прыём у сябры Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ажыццяўляецца Радаю Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' на падставе пісьмовай заявы ўступаючага і пры наяўнасці дзвюх рэкамендацый сяброў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' (з іх адна рэкамендацыя ад члена Рады). Рашэнне Рады аб прыеме ў сябры Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць членаў Рады.

4.3.1. Улік сяброў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' арганізуе Рада. Парадак і форму ўліку вызначае Рада Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр 'Вясна''.

4.3.2. Рада Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' можа даручыць прыём у сябры Грамадскага аб'ядняня ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' і іх улік тэрытарыяльным аддзяленням Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

4.4. Сябра Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' мае права:

— выбіраць і быць выбраным у выбарныя органы Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' (асобы, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту, не могуць быць абраны ў склад выбарных органаў) ;

—прымаць удзел з правам дарадчага голасу ў працы органаў, сябрам якіх ён не з'яўляецца;

— па даручэнні Рады ці яе Старшыні быць прадстаўніком Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ў дзяржаўных, грамадскіх і гаспадарчых органах і арганізацыях;

— выступаць з ініцыятывамі па любых пытаннях дзейнасці Грамадскага аб'яднання «Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— мець доступ да інфармацыі пра акцыі, якія рыхтуюцца ці ўжо адбыліся;

— адпаведна сваім перакананням і магчымасцям удзельнічаць у рэалізацыі праектаў і праграм Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— для выканання статутных мэтаў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' карыстацца матэрыяльна-тэхнічнай і сацыяльна-культурнай базай Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— свабодна выйсці з сяброў Грамадскага аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

4.5. Сябра Грамадскага аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' абавязаны:

— выконваць патрабаванні Статута, рашэнні выбарных органаў і сваёй дзейнасцю спрыяць дасягненню статутных мэтаў і задач;

— выконваць даручэнні Агульнага сходу і Рады;

— не перашкаджаць выкананню рашэнняў вышэйшага і выбарных органаў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— сваімі дзеяннямі не наносіць Грамадскаму аб'яднанню ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' матэрыяльную шкоду і шкоду дзелавой рэпутацыі;

— уплочваць членскія ўзносы ў вызначаным памеры.

4.6. Спыненне сяброўства ў Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр "Вясна" ажыццяўляецца шляхам дабрахвотнага выхаду ці выключэння.

4.6.1. Дабраахвотны выхад з Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ажыццяўляецца:

— па пісьмовай заяве сябра Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';

— шляхам адмовы ад штогадовай перарэгістрацыі.

4.6.2 Перарэгістрацыя азначае пісьмовае пацвярджэнне сваёй згоды працягваць сяброўства ў Грамадскім аб'яднанні ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''. Перарэгістрацыя праводзіцца Радаю штогод на пачатку каляндарнага года на працягу 30 дзен, а таксама можа праводзіцца паводле рашэння Рады перад Агульным сходам. Перарэгістрацыя перад Агульным сходам павінна пачынацца не раней чым за 30 дзен і сканчацца за 3 дні да планавай даты яго правядзення.

4.6.3. Сябра Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' можа быць выключаны Радай за парушэнне патрабаванняў Статута. Рашэнне Рады можа быць абскарджана на Агульным сходзе Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

4.7. Рашэнне Рады аб выключэнні з сяброў падлягае зацвярджэнню Агульным сходам. Агульны сход мае права спыніць сяброўства ў Грамадскім аб'яднанні ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ў выпадку нез'яўлення

тры разы запар на Агульныя сходы без паважных прычын (да апошніх адносяцца: хвароба, службовая камандыроўка і інш. на меркаванне Агульнага сходу).

4.8. Незацвярджэнне Агульным сходам рашэнняў Рады аб спыненні сяброўства з'яўляецца аднаўленнем сябра Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ў яго правах.

4.9. Пры спыненні сяброўства фінансавыя сродкі, ахвяраваныя і ўнесеныя ў Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр''Вясна'', звароту не падлягаюць.

## 5. Крыніцы і парадак фарміравання сродкаў і маёмасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

5.1. Крыніцамі фарміравання сродкаў і маёмасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' з'яўляюцца:

— членскія ўзносы;
— добраахвотныя ўзносы і ахвяраванні фізічных і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь і іншых краін;
— мэтавае фінансаванне праграм Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'';
— даходы ад уласнай вытворча-гаспадарчай і выдавецкай дзейнасці;
— крэдыты банкаў;
— іншыя не забароненыя заканадаўствам паступленні.

5.2. Сродкі і маёмасць Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' выкарыстоўваюцца для развіцця яго дзейнасці, накіроўваюцца на рэалізацыю статутных мэтаў і задач Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

5.3. Прыняццё рашэнняў аб набыцці, распараджэнні і адчужэнні маёмасці прымае Рада Грамадскгага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' з наступным зацвярджэннем Агульным сходам.

5.4. Бухгалтарскі ўлік і справаздачнасць Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' вядзецца адпаведна нормам дзеючага заканадаўства.

5.5. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр "Вясна" здзяйсняе разлікі з бюджэтам у парадку і памерах, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам, прадстаўляе ў вызначаным парадку ў дзяржаўныя органы бухгалтарскую, статыстычную і іншую справаздачу, нясе адказнасць за яе дакладнасць.

## 6. Парадак рэарганізацыі і ліквідацыі Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр "Вясна"

6.1. Спыненне дзейнасці Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' можа адбывацца праз яго рэарганізацыю або ліквідацыю.

6.2. Рэарганізацыя Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' адбываецца праз зліццё, далучэнне, падзел, вылучэнне, пераўтварэнне. Рэарганізацыя цягне за сабой пераход правоў і абавязкаў да правапераемнікаў. Рэарганізацыя Грамадскага аб'ядняня ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' адбываецца паводле рашэння Агульнага сходу, прынятага пайменным галасаваннем, з улікам заключэнняў усіх яго

выбарных органаў, з якімі сябры Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' маюць магчымасць пазнаёміцца не пазней чым за 10 дзён да яго правядзення.

6.3. Рашэнне Агульнага сходу лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш за 2/3 прысутнічаючых сябраў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

6.4. Грамадскае аб'яднанне ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' можа быць ліквідавана:

— паводле рашэння Агульнага сходу;
— паводле рашэння Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь суда на падставах і ў парадку, прадугледжаных дзеючым заканадаўствам.

6.5. Ліквідацыя Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' паводле рашэння Агульнага сходу адбываецца пайменным галасаваннем, з улікам заключэнняў усіх выбарных органаў Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', з якімі сябры Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' маюць магчымасць пазнаёміцца не пазней чым за 10 дзён да яго правядзення.

6.6. Рашэнне Агульнага сходу лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш за 2/3 прысутных сяброў Грамадскага аб'ядання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна''.

6.7. Ліквідацыя Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' ажыццяўляецца ліквідацыйнай камісіяй, якая прызначаецца органам, які прыняў рашэнне аб ліквідацыі. Гэты ж орган вызначае парадак і тэрмін правядзення ліквідацыі, зацвярджае рэгламент работы ліквідацыйнай камісіі. Ліквідацыйная камісія ацэньвае актывы Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'', задавальняе прэтэнзіі крэдытораў паводле дзеючага заканадаўства.

6.8. Сродкі і маёмасць Грамадскага аб'яднання ''Праваабарончы цэнтр ''Вясна'' пасля задавальнення маёмасных прэтэнзій крэдытораў накіроўваюцца на мэты, прадугледжаныя гэтым Статутам.

8

Прашнуравана і замацавана пячаткай
13 (трынаццаць) лістоў.
Кансультант Упраўлення
Грамадскіх аб'яднанняў
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь
С.М. Шляхто

Смотрите на обороте

28 октября 2002 года я, КОВАЛЬЧУК Г.И., нотариус города Минска, свидетельствую верность этой копии с подлинником документа, в последнем подчисток, приписок, зачеркнутых слов и иных неоговоренных исправлений или каких-либо особенностей не оказалось.

Зарегистрировано в реестре 3-1413

Взыскано государственной пошлины 17760 рублей,

и нотариального тарифа 1776 рублей.

Нотариус

КАВАЛЬЧУК ГАЛІНА ІЛЬІНІЧНА
НОТАРИУС-КОВАЛЬЧУК Галина Ильинична
НАТАРЫУС
НОН-Республика Беларусь Минск
горад МІНСК РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

Настоящая копия пронумерована, прошнурована и скреплена печатью на восьми листах.

Нотариус

КАВАЛЬЧУК ГАЛІНА ІЛЬІНІЧНА
НАТАРЫУС
НОН-Республика Беларусь Минск
горад МІНСК РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ